Источник: "Навука" - 2025-03-04

# ІВАН НАВУМЕНКА. ДАНІНА ПАМЯЦІ

У Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі адбылася канферэнцыя «Нацыянальныя літаратуры ў эпоху глабалізацыі: тэорыя, практыка адаптацыйных працэсаў, вынікі». Навуковы форум быў прымеркаваны да 100-годдзя з дня нараджэння Івана Якаўлевіча Навуменкі.






Доктар філалагічных навук, акадэмік, народны пісьменнік Беларусі Іван Навуменка доўгі час узначальваў Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, у 1985–1990 гг. ён быў дэпутатам і старшынёй Вярхоўнага Савета БССР. Адпаведна, у даследаванні жыцця і творчасці юбіляра ад самага пачатку праглядаліся тры магістральныя вектары прыкладання сіл: аналізаваліся літаратурная спадчына, здабыткі ў развіцці літаратуразнаўства, роля і здзяйсненні ў будаўніцтве незалежнай беларускай дзяржавы.

Усе выступленні і на пленарным, і на секцыйных пасяджэннях выявіліся яркімі, насычанымі інфарматыўна. Да тых вынікаў, што ўжо дасягнуты ў справе асэнсавання і ўшанавання постаці І.Я. Навуменкі (Інстытутам літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі падрыхтаваны і выдадзены 10-томнік пісьменніка, надрукаваны кнігі «Кулуарамі творчай майстэрні Івана Навуменкі» і «Летуценнасць і вялікія здзяйсненні: успаміны пра Івана Якаўлевіча Навуменку»), дадаліся новыя штрыхі.

Звесткі пра неапублікаваныя раней тэксты агучыў супрацоўнік Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Мікалай Трус. Цікавы погляд на асобу І. Навуменкі як дзяржаўнага дзеяча ў дырэктара Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Івана Саверчанкі (**на фота**) і члена-карэспандэнта НАН Беларусі Сцяпана Лаўшука. Уладзімір Ліпскі, які шмат гадоў узначальваў часопіс «Бярозка», прыгадаў дэталі супрацоўніцтва І. Навуменкі з рэдакцыямі дзіцячых выданняў.

Прагучаў даклад пра дакументальны фільм «Народны пісьменнік Міхась Лынькоў», аўтарам сцэнарыя да якога выступіў І. Навуменка. Былі прааналізаваны фактычна ўсе літаратуразнаўчыя працы юбіляра, і дакладчыкі ў адзін голас падкрэслілі, што архаічным гучанне навуменкаўскага слова сёння ніяк не назавеш. Атрымалі магчымасць выказацца тыя, хто працягвае справу Івана Якаўлевіча.

Ужо рыхтуецца зборнік навуковых артыкулаў, у якім будзе зафіксавана агучанае і прамоўленае. На магілу І. Навуменкі ўдзельнікі канферэнцыі ўсклалі кветкі – як даніну памяці і знак неперарыўнасці традыцый.

Аляксандр ЛАПАТА-ЗАГОРСКІ,
навуковы супрацоўнік аддзела беларускай літаратуры XX–XXI стагоддзяў Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы

Фота Марыны Варабей